# Уладзімір Іванавіч Захараў



**Захараў Уладзімір Іванавіч** – беларускі гітарыст, кампазітар і музычны педагог. Нарадзіўся 18 кастрычніка 1961 года ў горадзе Гродна. З 14 гадоў пачаў вучыцца гульні на гітары. У 1981 годзе скончыў Гродзенскае музычнае вучылішча (клас Денскевіч Л.А.), у 1991 годзе – Беларускую дзяржаўную кансерваторыю імя А.В. Луначарскага (клас Грыдзюшка Я.М., з верасня 1990 па чэрвень 1991 года - Жывалеўскага У.С.) і ў 1998 годзе - асістэнтуру-стажыроўку пры Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі па спецыяльнасці «Інструментальнае выканальніцтва (гітара)» з прысуджэннем акадэмічнай ступені магістра мастацтваў. Дыпламант VII міжнароднага конкурсу гітарыстаў у г. Кракаве (1992), лаўрэат VII міжнароднага конкурсу гітарыстаў у г. Гданьску (1993), удзельнік шматлікіх фестваляў у Расіі, Украіне, Беларусі, а таксама ў Польшчы і Іспаніі. Шмат канцэртуе. Вядзе майстар-класы, у тым ліку і за мяжой: у жніўні 2001 г. у ліку 6 майстроў-выканаўцаў быў запрошаны для правядзення майстар-класаў для іспанскіх і іншых замежных навучэнцаў і студэнтаў у рамках міжнароднага фестываля памяці Рехіно Сайнс дэ ла Маса ў іспанскім горадзе Бургос (Касцілья).

Уладзімір Захараў не толькі выканаўца, але і выдатны кампазітар. Яго гітарныя творы ўключаны ў сучасныя праграмы для пачатковых, сярэдніх і вышэйшых спецыяльных музычных навучальных устаноў Рэспублікі Беларусь, друкаваліся ў айчынных і замежных выдавецтвах. У 1978 годзе яго цыкл «Дзіцячы сшытак» быў удастоены вышэйшай узнагароды на конкурсе юных кампазітараў у Гродна. У 1996 годзе пры садзейнічанні Гродзенскага абласнога аддзялення Беларускага фонду культуры выдадзены нотны зборнік У. Захарава «Музыка для гітары», у які ўвайшлі тры яго п'есы «Прэлюдыі і фугетта на славянскія тэмы», фантазія «Грунвальдская пастараль», «Варыяцыі на літоўскую тэму». У 1997 г. італьянскае выдавецтва «Бербен» апублікавала першую частку У.І. Захарава «Дзіцячага сшытка» (Альбом дзіцячы). Ён гэтак жа з'яўляецца аўтарам шматлікіх перакладаў і апрацовак для гітары, п'ес для фартэпіяна, харавых і вакальна-інструментальных твораў.

У цяперашні час выкладае гітару ў Гродзенскім дзяржаўным музычным каледжы, філіяле кафедраў Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі і ў Гродзенскім дзяржаўным універсітэце ім. Я. Купалы. Сярод вучняў класа Уладзіміра Іванавіча – шэраг лаўрэатаў рэспубліканскіх і міжнародных конкурсаў: Яраслаў Гулецкі, Дзяніс Асімовіч, Павел Трацяк, Сяргей Разуваеў, Раман Ташпулодаў, Дзмітрый Семаў, Аляксандр Якушаў, Павел Кухта і інш. З педагагічнай працай Уладзімір Захараў сумяшчае канцэртную дзейнасць артыста, саліста-інструменталіста ў Гродзенскай абласной філармоніі.



Узнагароджаны Ганаровым знакам Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь «За значны асабісты ўклад у развіццё беларускай культуры» (1999), прэміяй Гродзенскага гарвыканкама «За творчыя дасягненні і асабісты ўклад у развіццё культуры горада» (2001), прэміяй Гродзенскага аблвыканкама імя А.І. Дубко «За творчыя дасягненні ў галіне культуры і мастацтва ў 2002 годзе» ў намінацыі «Настаўнік года».

# *Бібліяграфія*

**<u>Публікацыі Уладзіміра Захарава:</u>**

Захаров, В. Вдохновение не любит посещать ленивых: [беседа с В. Захаровым, гродн. музыкантом] / записала А. Никипорчик // Биржа информации (Гродно). – 2003. – 20 февраля. – С. 12.

Захаров, В. «Звук становится музыкой, когда он согрет душой исполнителя»: [беседа с В. Захаровым, гитаристом, преподавателем Гродн. муз. уч-ща, лауреатом премии им. А. Дубко облисполкома за вклад в развитие культуры в номинации "Преподаватель года"] / записала Л. Новицкая // Гродзенская праўда. – 2003. – 15 февраля. – С. 8.

Захаров, В. Неизвестное об известном: [беседа с гродн. гитаристом В. Захаровым] // Милицейский вестник. – 2012. – 31 мая. – С. 16.

Захаров, В. О любви, мечтах, о жизни, о себе: интервью с В. Захаровым (род. в 1961 г., Гродно), бел. гитаристом / записала С. Мамедова // Милицейский вестник. – 2011. – 17 ноября. – С. 23.

Захаров, В. Под грифом известности: о творческом вечере бел. гитариста Владимира Захарова в ГГИАМ / записала С. Мамедова // Милицейский вестник (Гродно). – 2011. – 1 декабря. – С. 23.

Захаров, В. Под грифом известности: о творческом вечере бел. гитариста Владимира Захарова в ГГИАМ / записала С. Мамедова // Милицейский вестник (Гродно). – 2012. – 31 мая. – С. 16.

Захаров, В. Цените золото в искусстве: интервью с В. Захаровым (род. в 1961 г., Гродно), бел. гитаристом, лауреатом международных конкурсов, преподавателем Гродн. музыкального колледжа, солистом обл. филармонии / беседовала А. Антонова // Гродзенская праўда. – 2011. – 19 октября. – С. 32.

Захараў, У. З гітарай па жыцці / У. Захараў // Гродзенская праўда. – 2005. – 10 лютага. – С. 6.

Меркулова, Л.И. Особенности звукописи в миниатюрах для фортепиано «Античные образы» Владимира Захарова и их исполнительское осмысление / Л.И. Меркулова, В.И. Захаров // Актуальные проблемы мировой художественной культуры: материалы Междунар. науч. конф., посвящ. памяти проф. У.Д. Розенфельда (Гродно, 25 - 26 марта 2010 г.): в 2 ч. – Гродно, 2011. – Ч. 2. – С. 243–247.

**<u>Публікацыі пра творчасць Уладзіміра Захарава:</u>**

Абдулаева, С. Намаляваць агонь гітарай / С. Абдулаева // Культура. – 2006. – 14-20 кастрычніка. – С. 12.

Владимир Захаров [(род. в 1961 г., Гродно)] / фото // Беларуская гітара: музыкальны альманах / гал. рэд. В. Кіеня. – Б.м.: Синтомс, 2011. – Вып. 13. – С. 2.

Береснева, Е. Пой, гитарная струна: [о творчестве гродн. гитариста В. Захарова] / Е. Береснева; фото // Рэспубліка. – 2003. – 22 февраля. – С. 11.

Гамина, В. Баха и Паганини слушают в Сопоцкине: [о концерте В. Захарова, преподавателя Гродн. муз. училища, гитариста, лауреата междунар. конкурсов] / В. Гамина // Перспектива. – 2004. – 2 декабря. – С. 3.

Здановіч, А. Гісторыя на крылах музыкі і паэзіі / А. Здановіч // Гродзенская праўда. – 2007. – 15 марта. – С. 4.

Коршунов, И. Лауреат международных конкурсов Владимир Захаров [Изоматериал]: Гитара: [Плакат] / Фото И. Коршунов; Гос. учреждение культуры «Гродн. обл.филармония». – Гродно: Б.и., 2003. – 1 л.

Куль-Сяльверстава, С. Валодзю: акраверш, прысвечаны гродзенскаму музыканту Уладзіміру Захараву / С. Куль-Сльверстава // Куль-Сяльверстава, С. Вершы. Байкі. Паэмы / С. Куль-Сльверстава. – Гродно, 2012. – С. 85.

Куль-Сяльверстава, С. Вясновыя сустрэчы з гітарай / С. Куль-Сльверстава // Гродзенская праўда. – 2008. – 3 мая. – С. 5.

Куль-Сяльверстава, С. «Гитара +...» / С. Куль-Сльверстава // Гродзенская праўда. – 2011. – 16 лютага. – С. 7.

Лаўрэат міжнародных конкурсаў Уладзімір Захараў [Изоматериал]: Канцэрт гітар. музыкі: [Плакат] / Гродзен. абл. філармонія. – Гродна: Б.в., 2000. – 1 л.

Новицкая, Л. Испанское лето Владимира Захарова / Л. Новицкая // Гродзенская праўда. – 2001. – 16 октября.

Нямера, К. Гітарныя гукі, быццам сталактыты / К. Нямера // Культура. – 2005. – 29 студзеня. – С. 18.

Романюк, Н. Захаров в поиске: [творческий вечер гитариста В. Захарова в ГОНБ им. Е. Карского] / Н. Романюк // Перспектива. – 2012. – 30 мая. – С. 18.

Успенский, К. Музыкальные миры Владимира Захарова / К. Успенский; фото // Беларуская гітара: музык. альманах / гал. рэд. В. Кіеня. – Б.м.: Синтомс, 2011. – Вып. 13. – С. 2.

Шевченок, М. На крыльях музыки: [о творчестве преподавателя Гродн. муз. уч-ща, гитариста, победителя междунар. конкурса гитаристов 1992 г. в Кракове В. Захарове] / М. Шевчонок // Гродзенская праўда. – 1998. – 17 октября. – С. 4.